**Беларуская мова 2 клас**

**Тэма:** Вымаўленне і правапіс слоў з "ў"

**Мэта:** актуалізаваць веды пра гукі [у], [ў] і літары, якімі яны абазначаюцца на пісьме.

**Задачы:** пазнаёміць з правілам правапісу **ў** у словах, адпрацоўваць уменне яго прымяняць; развіваць фанематычны слых, вымаўленчыя навыкі; выпрацоўваць уменне тлумачыць правапіс слоў; узбагачаць слоўнікавы запас назвамі птушак; развіваць звязнае вуснае маўленне; выхоўваць цікавасць да вывучэння роднай мовы, клапатлівыя адносіны да птушак.

**Ход урока**

1. **Арганізацыя пачатку ўрока. Псіхалагічны настрой.**

Я ўмею хутка думаць.
Я умею разважаць.
На ўроку вельмі добра
буду ўсё запамінаць.

2. **Праверка дамашняга задання**

Пр. 132. Назавіце літары, якія абазначаюць зычныя гукі?

3. **Актуалізацыя раней вывучанага. Арфаграфічная хвілінка**

– Ці любіце вы гуляць у гульні? Літары таксама часам гуляюць у хованкі. Здагадайцеся, якая літара "збегла" з наступных слоў:

Маліна..ка, а..сянка, кніга..ка, ласта..ка, па..лін, жа..рук

*(на дошцы размяшчаюцца малюнкі прапанаваных птушак)*

– Што аб'ядноўвае прапанаваныя словы?

*(Гэта назвы птушак, ва ўсіх гэтых словах пішацца* ***"ў")***

4. **Хвілінка чыстапісання**

*оў ёў аў іў еў яў ыў эў уў*

– Запішыце назвы птушак у якіх ёсць **"ў"** *(выкарыстоўваецца папярэдняе заданне)*

5. **Паведамленне тэмы і мэты ўрока**

**–** Сёння на ўроку мы знойдзем адказ на пытанне: чаму ў беларускай мове ёсць **у** і **ў;** калі пішацца **у,** а калі **ў.**

6. **Вывучэнне новай тэмы**

**–** Прачытайце вершы. Знайдзіце словы з літарай **"ў".** Падлічыце, колькі разоў сустракаецца гэта літара.

*Вучні чытаюць вершы самастойна і падлічваюць літары* ***"ў". Затым*** *чытаюць прапанаваныя вершы хорам па чарзе: хлопчыкі і дзяўчынкі.*

*Верш для дзяўчынак*

Сёння досвіткам А**ў**сей
Злаві**ў** а**ў**сянку **ў** а**ў**се.
Бы**ў** авёс расяны зранку –
У расе **ў**ся а**ў**сянка.

К. Камейша

*Верш для хлопчыкаў*

Курлыкаюць над лесам жура**ў**лі.
Над вёскай клінам гусі праплылі.
На плот высока певень узляце**ў**.
Н**ў**жо і ён у вырай захаце**ў**?

В. Гардзей

– Назвы якіх птушак вы пачулі ў гэтых вершах? У якіх назвах сустракаецца літара **“ў”**?

Назавіце словы з літарай **“ў”.** Запішыце іх у сшыткі і падкрэсліце “**ў”.**

**–** Давайце вызначым, калі ж пішацца **“ў”**

**<u>Літара “ў” (у нескладовае) пішацца пасля галосных:</u>**

1) у пачатку слова: на **ў**злеску, у расе **ў**ся;
2) у сярэдзіне слова: ла**ў**ка, а**ў**сянка, дзя**ў**чынка, жура**ў**лі;
3) у канцы слова: узляце**ў,** захаце**ў,** Магілё**ў.**

**<u>Запомні:</u>**

**<u>“ў” не бывае:</u>**

1) **у пачатку сказа**: **У**ладзік павіншаваў маму.
2) **Пасля знакаў прыпынку**: Узляталі, узнімаліся спалоханыя гусі.
3) **Вялікай літарай**: брат Уладзіслаў, дзяўчынка Ульяна

**Фізкультхвілінка**

| | |
|---|---|
| Холад цісне ўсё мацней, | |
| Стынуць дрэвы ў шэрані, | *Рыўкі прамымі рукамі* |
| Прабірае да касцей | *Хадзьба на месцы* |
| Верабейку шэрага. | |
| | |
| Скача, скача па двары | |
| Пырхае, чырыкае. | *Скачкі* |
| Гора, што ні гавары, | *Нахілы тулава ўправа, улева* |
| Гора, дый вялікае. | |
| | |
| Абляцеў усё сяло, | *Імітацыя палёту* |
| Гумны ўсе і сметнікі, | |
| Ні крупінкі, як назло, | |
| Не разжыўся, бедненькі. | |
| | |
| Ох, і цяжкая зіма | *Прысяданні* |
| З лютай сцюжай гэткаю! | |
| Сеў бядак і задрамаў | *Селі і апусцілі галаву* |
| Пад старой паветкаю. | |

Н. Гілевіч

– Скажыце, а як мы можам дапамагчы бедным птушкам зімой? *(меркаванні і прапановы дзяцей)*

**7. Замацаванне вывучанага**



7.1. Работа па падручніку (практ. 136)

— Прачытайце тэкст. З якой птушачкай вы пазнаёміліся?

– Якая птушка самая маленькая ў Беларусі? *(Каралёк)*

*(Запісаць адказ на пытанне ў сшытку)*

**7.2. Калектыўная работа на дошцы.**

*Жу/ўрботным клінам журау/ўлі*
*На поу/ўдзень клінам паплылі.*
*М. П.азнякоў*

- Прачытайце. Устаўце патрэбныя літары ў словы.
- Спішыце. Падкрэсліце літары, пасля якіх пішацца літара **“ў”.**

**7.3. Самастойнае прымяненне ведаў. Гульня “Перакладчыкі”**

– Перакладзіце словы на беларускую мову. Памятайце правілы напісання літары **“ў”.**

*Скворечник, ласточка, петушок, журавли.*

– Знайдзіце ў слоўнічку (с. 140) слова з **“ў”.**

8. **Дамашняе заданне.** – Пр. 137
9. **Падвядзенне вынікаў урока. Рэфлексія**

– З напісаннем якой літары пазнаёміліся сёння на ўроку?

– Калі пішацца **“ў”**?

– Калі **“ў”** не бывае?

*Кожны вучань атрымлівае сілуэт літары* ***“ў”.***

– Трэба расфарбаваць літару **ў** згодна з наступным колерам:

– Зялёны – правіла напісання **“ў”** засвоіў;

– Жоўты – правіла засвоіў, але не заўсёды магу прымяніць;

– Чырвоны – патрабую дапамогі!

Дадатак



Малінаўка



Аўсянка



Жаўрук



Кнігаўка



Ластаўка



Паўлін

Паўлін – самая незвычайная і выдатная ў свеце птушка. Радзімай паўлінаў лічыцца Індыя і востраў Шры-Ланка. Гэтыя птушкі валодаюць моцнымі нагамі, дзякуючы чаму хутка бегаюць і з лёгкасцю лавіруюць паміж кустоў і дрэў.